СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН [illegible] РК КП(б)Б

№ 5 (736) | Пятніца, 21 студзеня | 1944 г.

ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

„Калі вайна аказалася немінучай — усё для вайны, і малейшая распушчанасць і недастатковасць энергіі павінны быць караемы па закону ваеннага часу“.

В. І. ЛЕНІН.

## Справа Леніна—бяссмертна

Дваццаць год назад—21 студзеня 1924 года ўшоў ад нас правадыр і арганізатар бальшэвіцкай партыі, ажыццявіцель Окцябрскай Рэвалюцыі, стваральнік сацыялістычнай Дзяржавы — Уладзімір Ільіч Ленін.



Мудры прадаўжацель справы Леніна, вялікі Сталін гаварыў нашаму народу: „Памятайце, любіце, ізучайце Ільіча, нашага настаўніка і друга. Змагайцеся і перамагайце ворагаў унутраных і знешніх па Ільічу. Будуйце новае жыццё, новы быт, новую культуру па Ільічу. Не адмаўляйцеся ад малай работы, бо з малага будуецца вялікае,—а гэта адзін з запаветаў Ільіча“.

Ідучы па Ленінскім шляху, кіруемая геніяльным Сталіным наша краіна стала магутнай індустрыяльнай Дзяржавай, на абароне якой стаіць гераічная Чырвоная Армія.

Самая сільная чэрта ў характары і светапоглядзе Леніна,—яго глыбокая вера ў творчыя сілы і жыццёздольнасць народа, здольнага не толькі стварыць новае жыццё, але і адстаяць сваю Айчыну ад ворагаў, не гледзячы ні на якія іспыты, здольнага абараніць свой Чырвоны Сцяг, заваёваны шматгадовай барацьбой і працай.

Ленін гаварыў, што вайна ёсць усестаронні іспыт усіх матэрыяльных і духоўных сіл кожнага народа.

„Вялікі Ленін, стварыўшы нашу Дзяржаву, гаварыў, што асноўнай якасцю савецкіх людзей павінна быць храбрасць, адвага, няведанне страха ў барацьбе, гатоўнасць біцца разам з народам супроць ворагаў нашай Радзімы“,- словы, якімі таварыш Сталін указаў на даную Леніным ацэнку якасці бальшавіка.

Светлы неўміручы вобраз Ільіча, яго барацьба за шчасце рабочых і сялян натхняе савецкіх людзей, слаўных воінаў Чырвонай Арміі, партызан самаадддана, неўхісна дабівацца перамогі над ворагамі дзеля шчасця і свабоды сваей Радзімы.

У гераічных справах на фронце і ў тылу, у подзвігах мужных народных мсціўцаў жыве непераможны дух вялікага Леніна.

Зараз пад магутнымі ўдарамі нашых войск гітлераўская армія адкатваецца на захад, усцілаючы ўсе дарогі масаю тэхнікай і трупамі сваіх салдат і афіцэраў. Нашы войскі прарвалі абарону немцаў на Ленінградскім і Волхаўскім франтах. Прадаўжаецца масавое выгнанне немцаў з Украіны і Беларусі.

Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам мудрага наследніка Ленінскіх спраў вялікага Сталіна наш народ, Чырвоная Армія ідзе да канчатковай перамогі над подлымі нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

## З аператыўных зводак Савінфармбюро

(З 15 ПА 20 СТУДЗЕНЯ)

На Ленінградскім фронце нашы войскі перайшлі ў наступленне з раёнаў Пулкава і паўднёвей Оранієнбаум. Развіваючы наступленне, савецкія войскі прасунуліся ўперад ад 12 да 20 км. і расшырылі прарыў па фронту да 40 км., занялі 80 населёных пунктаў, у тым ліку гарады Пецергоф, Краснае Сяло і важны вузел дарог Ропша. У ходзе наступлення нанесены цяжкія паражэнні 7 пяхотным дывізіям немцаў. Захоплена ў палон больш 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, на полі бою праціўнік аставіў да 20.000 трупаў.

Войскі Волхаўскага фронта, перайшоўшы ў наступленне паўночней Ноўгарада за 5 дзён баёў прасунуліся ўперад да 30 км., расшырыўшы прарыў фронта да 50 км., занялі 30 населёных пунктаў і перарэзалі чыгунку Ноўгарад-Ленінград. Паўднёвей Ноўгарада нашы войскі паспяхова фарсіравалі [illegible] возера Ільмень, занялі рад населёных пунктаў, перарэзалі шасэ і чыгунку Ноўгарад—Шымск.

Паўночней Новасакольнікі нашы войскі прарвалі абарону немцаў на фронту 15 км. і ўглыб да 8 км., занялі звыш 40 населёных пунктаў і чыгуначную станцыю Насва.

Захадней Навоград-Валынскі і паўднёва-захадней Сарны нашы войскі авалодалі райцэнтрамі Ровенскай вобласці Тучын, Кастопаль, Гошча і райцэнтрам Каменец-Падольскай вобласці горадам Славута.

За 5 дзён баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 774 нямецкіх танкі і збіта 292 самалёты праціўніка.

## Камсамольцы—падрыўнікі

Заклік тав. СТАЛІНА усё для абароны краіны, усё на разгром нямецкай гітлераўскай арміі знайшоў шырокі водгук сярод камсамольцаў. Яны дружна ўзяліся за зброю, з лозунгам „За справу Леніна — Сталіна не пашкадуем свайго жыцця" пайшлі ў партызанскія атрады біць, калоць, разбіць фашысцкіх варвараў.

Сотні камсамольцаў за час вайны авалодалі новымі спецыяльнасцямі — сталі майстрамі падрыўной справы, снайперамі, дыверсантамі, разведчыкамі, артылерыстамі, аўтаматчыкамі, кулямётчыкамі, аружэйнікамі.

Міхаіл П. з атрада імені С. гэта скромны таварыш. Да вайны ніякай падрыўной справай не займаўся. А сёння, калі гэта патрабавала Радзіма, Міхаіл стаў выдатным падрыўніком. Яго рукамі пушчана пад адкос 8 нямецкіх воінскіх эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай.

Выдатную славу заваявалі падрыўнікі-камсамольцы Іван, Леанід, Уладзімір М., з атрада імя Б. Камсамолец Іван М. узарваў 8 аўтамашын праціўніка, камсамолец Уладзімір М. 5 аўтамашын, а Леанід М. пусціў пад адкос 2 воінскіх эшалоны немцаў і падарваў 3 аўтамашыны.

Ёсць чым ганарыцца падрыўнікам-камсамольцам Мікалаю М., Пятру С. і Івану Б., з атрада імені Ч., Васілю К. і Паўлу С. з атрада імені Ф. і камсамольцу тав. Ш., з атрада імені К. Ад іх рук не адзін немец на векі вечныя аставіў свае косці угнойваць беларускую зямлю. Не адзін дзесятак воінскіх эшалонаў і аўтамашын не дайшлі да фронта, на шляху пушчаныя ў паветра падрыўнікамі.

У дні, калі ўся краіна саветаў адзначае 20-ю гадавіну з дня смерці любімага Леніна, члены Ленінска—Сталінскага Саюза Моладзі—камсамольцы яшчэ мацней ударыць па ворагу і, не шкадуючы свайго жыцця, будуць змагацца за вялікую справу Леніна, за хутчэйшы і канчатковы разгром нямецкіх захопнікаў.

АРКАДЗЬ С.,
сакратар РК ЛКСМБ.

## І мы помсцім ворагу

Тое, што нясе з сабой нямецкі фашызм у захопленых абласцях — знішчэнне гарадоў, вёсак і культуры, расстрэлы старыкоў, жанчын і дзяцей, а таксама масавы ўгон у нямецкае рабства народаў Еўропы заставілі нас, былых салдат славацкай арміі, з сэрцам, поўным ненавісці і помсты ворагу, са зброяй у руках перайсці на старану партызан.

Яшчэ мы маладыя партызаны, але днём і ноччу не даём спакою немцам, на шасэйных дарогах шляхам мініравання мы ўзарвалі 6 нямецкіх машын, спалілі 2 масты, два разы ўдзельнічалі ў падрыве чыгункі, парвалі 2.700 метраў сувязі праціўніка.

Славакі АДАМІЧКА і
ПАСТАРЫК,
партызаны атрада імя Д.

## Не на катаргу, а ў партызаны

Гітлераўцы хацелі загнаць мяне на катаржныя работы ў Германію. Але, атрымаўшы загад душагуба Дынаўскага на выезд у Германію я разам са сваім 50 гадовым бацькам са зброяй ушоў у блізкі партызанскі атрад.

За кароткі тэрмін сваей партызанскай дзейнасці я удзельнічаў у спуску пад адкос нямецкага воінскага эшалона, у падрыве 2 аўтамашын і знішчэнні тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.

Не катаржнікам я стаў, а народным мсціўцам і буду помсціць ненавісным ворагам адчувальна.

МІХАІЛ К.,
партызан атрада імя С.

## Нямецкай бомбай па немцах

Нямецкая бомба, якую фрыц скінуў з самалёта на нашую вёску, была знойдзена партызанамі атрада імя Ч. не разарванай.

— Добра, добра, — заўважыў адзін партызан. Няхай фрыцы па больш кідаюць такіх бомб. Яны нам прыгодзяцца. Гэтымі бомбамі мы будзем пускаць у паветра іх-жа аўтамашыны.

Праз некаторы час бомба аказалася ў руках партызана Барыса Т. Ён з групай партызан накіроўваецца на баявую аперацыю. Складаная аперацыя. Яму пастаўлена задача — нямецкай бомбай ўзарваць мост на важнай магістралі.

Група прыбліжаецца да маста. Праз некалькі хвілін, і бомба пад мастом. Адна за адной, як вужакі, рухаюцца нямецкія аўтамашыны, напоўненыя дрыжачымі ад страху, як асіна, немцамі.

Яшчэ хвіліна, і бомба ўзрываецца. Мост, 2 аўтамашыны і 31 гітлеравец ляцяць у паветра. З-заду едучым немцам удалося падабраць толькі костачкі, ды каскі.

Добрая нямецкая бомба. Добра яна знішчыла гітлераўскіх „воінаў".

Ц.

## За граніцай

У Італіі войскі саюзнікаў працягваюць прасоўвацца ўперад. Англійскія і амерыканскія часці захапілі новыя высоты.

*** У Югаславіі днём і ноччу ідуць баі ў цэнтральнай Босніі і другіх раёнах. У апошніх баях часці Югаслаўскай народна-вызваліцельнай арміі збілі два нямецкіх бамбардыроўшчыка і знішчылі 5 танкаў.

*** У снежні ў ЗША выпушчана 8.802 самалёты. Усяго за 1943 год у Амерыцы згатоўлена 85.946 самалётаў, а ў 1942 годзе было выпушчана 47 тысяч самалётаў.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец"